Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6), Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	[Пад]піска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адраса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 41 — Вільня, Серада 24-га жніуня 1927 г. — Год I

90,000 пазбаўленых правоў.

Выбары ў самаўрады па ўсей Віленшчыне і Наваградчыне закончаны. Адбываецца—а шмат дзе й адбыўся—другі мамэнт выбарнае акцыі: выбары войтаў і сойміковых ўладаў.

Паскольку агульны абраз і вынікі выбараў у гмінныя рады сьведчаць аб перамозе сьвядомых беларусаў з сялянска-работніцкай ідэалёгіяй (хадэкі, сельсаюзьнікі і павлюкевічавы „полёнофілы“ скандальна праваліліся!), дык у другой стадыі выбараў бачым даволі сумнае зьявішча: адміністрацыйныя ўлады не зацьвярджаюць, або „завяшаюць“ выбраных гміннымі радамі войтаў, аб якіх ведама, што яны належалі да зачыненае польскім урадам партыі — „Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады“. Пагроза, пры помачы якое Павлюкевіч агітаваў проці выбіраньня ў самаўрады былых грамадаўцаў, зьдзяйсьняецца на дзеле....

Ня будзем тутака шмат затрымлівацца на факце адміністрацыйнага націску на волю народных выбранцаў. Адзначым толькі, што, накідаючы сялянству—замест выбраных імі войтаў—„мілых уладзе“ начальнікаў гмінаў па назначэньню, паны старосты гэтым самым бяруць на сябе ўсю адказнасьць за працу гмінных самаўрадаў і заціраюць гэтак падставовую адзнаку самаўрадаваньня. За тое зьвернем увагу на *матыў, прычыну незацьвярджаньня* выбіраных на войтаў асоб—толькі за тое, што яны — былыя грамадаўцы.

Як ведама, разгромленая ўрадам „Грамада“ ні ў сваей праграме, ні ў сваей тактыцы ня выявіла нічога такога, за што можна было-б пазбавіць грамадзкіх правоў усіх яе сяброў. Мы памятаем, што ў мамэнт арыштаў грамадаўскіх паслоў і пасьля—пры ліквідацыі арганізацыі—ўлада вінавbadаціла перадусім *павадыроў* арганізацыі, якія быццам-то падпарадкаваліся нелегальнай і „выврotовай“ камуністычнай партыі. Аб тым, каб *ідэалёгія* „Грамады“ была „праступная“, мы нічога ня чулі. І проці грамадаўцаў (апрача заарыштаваных асоб) урад *ня мог* распачаць судовага працэсу: іх ня было ў чым абвінаваціць. Але-ж вось, ня гледзячы на гэта, як відаць цяпер з адносінаў адміністрацыі да былых грамадаўцаў у самаўрадах*), усе *дзевяцьдзесят тысяч сяброў былае „Грамады“ як-быццам абвешчаны адміністрацыйнай уладай пазбаўленымі грамадзкіх правоў*—перш навет, чым суды выдалі свой прысуд у справе абвінавачаных панам Мэйштовічам у „антыпаньствовасьці“ павадыроў арганізацыі! І хаця паны ваяводы папераджалі, што будуць сурова караць толькі тых, хто й *пасьля* ліквідацыі, урадам „Грамады“ будзе да яе належаць, — на дзеле выходзе, што ўжо пакаралі ўсіх, хто *належаў* да арганізацыі *да* яе разгрому!

Проці такога паступаньня адміністрацыі мы прымушаны рашуча запратэставаць. У Польшчы—паводле Канстытуцыі—існуе свабода сумленьня, і тое, што беларускія працоўныя масы „вераць пагрaмадаўску“, што яны выявілі гэтую сваю веру, запісываючыся ў легальную *ў той час* арганізацыю,— гэта ня можа быць падставай дзеля перасьледаваньня іх, дзеля пазбаўленьня найбольш актыўных, найбольш грамадзка-сьвядомых выбранцаў нашае вёскі прыналежнага ім права працаваць у самаўрадах дзеля агульнае карысьці. А на землях Заходняе Беларусі аказаліся пазбаўленымі гэтага права—паўтарем — 90,000 людзей, былых сяброў „Грамады“,—пазбаўленымі іх навет на неазначаны час!

Ці нармальна гэта, ці магчыма й дапусьціма ў якой-колечы нармальнай дзяржаве?!

*) Дый ня толькі ў самаўрадах, а ў-ва ўсіх ведамствах, асабліва-ж у міністэрстве асьветы!

Сусьветная забастоўка пратэсту.

Бюро II Інтэрнацыяналу атрымала ад амэрыканскага камітэту абароны Сакко і Ванцэтті тэлеграму з заклікам—абвясьціць сусьветную забастоўку пралетарыяту з пратэстам проці казьні вязьняў.

І рымскі Папа зацікавіўся справай Сакко і Ванцэтті.

Рымскі Папа ўрэшце зацікавіўся справай жыўцом пахаваных у амэрыканскай турме вязьняў Сакко і Ванцэтті. Ён даручыў свайму нунцыю (паслу) ў Вашынгтоне — разам з амэрыканскімі кардыналамі—старацца аб памілаваньні засуджаных на сьмерць вязьняў.

Францыя. „Юманітэ“ прызывае да байкоту Амэрыкі і да дэманстрацыі супроць прыехаўшых амэрыканскіх легіянэраў. На суботу ўвечары камуністычная партыя склікала ў Парыжы дваццаць мітынгаў пратэсту. У Парыжу паліцыяй зроблены вялікія прыгатаваньні на выпадак разрухаў. Асабліва ўсілена ахарона амэрыканскага пасольства.

Англія. Адмова найвышэйшага суда назначыць новы працэс у справе Сакко і Ванцэтті выклікала цэлую буру пратэсту ў Англіі. Ня гледзячы на тое, што ў-ва ўсіх пануе перакананьне, што прысуд будзе выкананы, адбываюцца ў яшчэ большым маштабе мітынгі і пратэсты. Найслаўнейшыя пісьменьнікі, паэты і найвыдатнейшыя работніцкія правадыры апублікавалі ў работніцкай газэце „Дэлі Гэральд“ адозву проці пастановы Бастонскага суда.

Джон Галсуфті піша: „Ня гледзячы на тое, ці засуджаныя вінны, ці нявінны, сам факт, што засуджаныя прасядзелі сем год пасьля прысуду сьмерці ў турме, каб толькі пасьля быць забітымі, мусіць узварушыць сумленьне сьвету“.

Трэбуйце адказу!

Да грамадзян і паўнамоцнікаў, склаўшых дэклярацыі на ўрадавыя беларускія школы на 1927/28 школьны год.

У сувязі з распараджэньнем міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы з 7/I 1925 г. на падставе ўставу аб арганізацыі беларускага школьніцтва з 31./VII. 1924 г., школьны інспэктар, разглядзеўшы дэклярацыі **не пазьней 31-га траўня** (мая), робіць сваё заключэньне і з усімі матар'яламі справу перадае Куратару. На падставе дадзеных інспэктарам прапазіцый, куратар **у працягу месяца** рашае аб мове навучаньня ў тэй ці іншай школе і аб сваім рашэньні праз абвестку **паведамляе заінтарасаваную людначасьць**. Апроч таго, аб сваім рашэньні Куратар паведамляе аднаго з тых бацькоў, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у беларускай мове, і аднаго з тых, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у польскай мове.

Пастанову Куратара бацькі могуць абжалаваць да Міністра Асьветы ў працягу 14 дзён ад дня паведамленьня праз абвестку.

Усе грамадзяне і паўнамоцнікі школьных абводаў, склаўшыя дэкляарацыі на ўрадовую беларускую школу на 1927/28 школьны год, павінны **дамагацца праз школьных інспэктароў пастаноў Куратара** (калі Куратар сам не паведаміў) у справе арганізацыі беларускіх урадовых школаў на 1927/28 школьны год.

Пажадана было-б, каб паўнамоцнікі школьных абводаў, а там, гдзе паўнамоцнікаў няма, то бацькі ў ліку **двух даведаліся-б** у вышэйсказанай справе ў **мяйсцовага школьнага інспэктара асабіста**, але, калі значная адлегласьць школьных абводаў ад мяйсцовых школьных інспэктаратаў гэтаму перашкаджала-б, то хай зварочваюцца **пісьменна** (заказнымі пісьмамі) з цьвёрдым дамаганьнем пастановы Куратара ў справе адчыненьня беларускіх урадавых школаў на 1927/1928 школьны год.

Увага: Пад словамі: „школьны абвод“ разумеюцца бліжэйшыя вёскі, якія зложылі дэкляарацыі агулам на 40 дзяцей. Таксама будзе лічыцца школьным абводам і 1 вёска, сяляне якой зложылі дэкляарацыі на 40 дзяцей.

Галоўная Управа
Таварыства Беларускае Школы
Вільня, сьв.-Ганны 2—3.

Справа Сакко і Ванцэтті.

Найвышэйшы суд штату Мэсачузэт адкінуў просьбу Сакко і Ванцэтті ў справе ўзнаўленьня працэсу. Калі новыя стараньні абаронцаў у астатнюю гадзіну не дадуць вынікаў, тады Сакко і Ванцэтті ў часе друкаваньня гэтага нумару ў раньніх гадзінах у аўторак будуць забіты.

Найвышэйшы суд штату Мэсачузэт адкінуў: 1) просьбу абаронцаў Сакко і Ванцэтті аб узнаўленьні працэсу з прычыны абмылкі; 2) скаргу проці пастановы судзьдзі Тайэра; 3) просьбу аб уневажненьні прыгавору проці Сакко і Ванцэтті; 4) просьбу аб новым адкладзе выкананьня прыгавору над засуджанымі.

Найвышэйшы суд у штаце Мэсачузэце ня прызнаў паважнымі довады абароны, кіраваныя проці прыгавору судзей Сэндэрсона і Тайэра, і адкінуў сьцьверджаньне судовае абмылкі. Абарона абвясьціла, што яна падае ў найвышэйшы суд Злучаных Штатаў апэляцыю, каб дабіцца разгляду гэтай справы ў найвышэйшай судовай інстанцыі Амэрыкі. Надзеі на ўдачу амаль ніякай няма.

Астатнія дні Сакко і Ванцэтті.

Абаронцы паведамілі Сакко і Ванцэтті аб пастанове суда. Сакко спакойна выслухаў і заявіў: „Мы гэтага чакалі“. Ванцэтті закрычэў знэрваваны: „Я ведаў гэта! Клічце мільён людзей“!

Ванцэтті пачынае вясьці сябе так, што абаронцы лічаць, быццам розум Ванцэтті ў выніку доўгага вастрогу і сталай няпэўнасьці жыцьця ў працягу 7 гадоў — памуціўся. Ванцэтті асабліва дамагаўся ўстаноўкі радыёапарату ў сваей камэры, каб расказаць сьвету сваю гісторыю.

Абодва засуджаныя былі зусім спакойныя, калі начальнік турмы вёў іх у камэры сьмяротнікаў. Абодва засуджаныя і крыміналіст Мадэйрас павінны былі, каб трапіць у гэтыя камэры, прайсьці праз пакой казьні. Мадэйрас быў зноў пасаджаны ў цэлю № 1, Сакко ў цэлю № 2, Ванцэтті ў цэлю № 3. Гэта азначае таксама і парадак, у якім будзе адбывацца казнь.

Сястра Ванцэтті прыехала ў Нью-Іорк. Яна ня думае прасіць міласьці для брата ў Фулера.

Тэрорыстычных актаў да суботы вечарам яшчэ ня было. Ня гледзячы на гэта, у Бастоне, Нью-Іорку і іншых вялікіх местах робяцца ўладай далёка сягаючыя прыгатаваньні на выпадак іх. Усілена ахрана ўсіх грамадзкіх устаноў. У штаце Мэсачузэце асабліва ахраняюцца ўсе склады з дынамітам. Многа страхуюцца ад забурэньня. У той час, калі абарона прыкладае ўсе стараньні, каб выратаваць засуджаных, дык бастонская буржуазія прыкладае ўсе свае сілы, націскаючы на Фулера, каб не адлажыў ізноў казьні. Фулер, вельмі багаты прамысловец, асабліва цэніцца за сваю ненавісьць да „радыкалаў“. Яго выбар за губэрнатара выклікаў у сваім часе востры пратэст з боку работнікаў.

Сакко спыніў галадоўку.

Пад націскам жонкі і абаронцаў Сакко спыніў галадоўку, якая трывала аж 30 дзён.

ПРАТЭСТЫ.

Пагроза агульнай забастоўкі пратэсту ў Амэрыцы.

Амэрыканскія Прафэс. Саюзы пастанавілі згодна—абвясьціць ў-ва ўсіх Злучаных Штатах агульную забастоўку 22 жніўня, калі выкананьне прысуду сьмерці над Сакко і Ванцэтті адбудзецца.

Што робіцца у Кітаі.

У Кітаі — пакуль на фроньце йдзе пераможнае наступленьне Чанг-Тсо-Ліна — пачалося ізноў глыбокае хваляваньне народных масаў, якія, зразумела-ж, не маглі астацца раўнадушнымі да таго, што здарылася з справай іх вызваленьня, праваленай няздарнымі ды нясумленнымі павадырамі народнага руху.

Трэба наперад сказаць, што англійскія ды японскія агенты і іхныя найміты перадчасна трыумфуюць з прычыны разгрому арміяў Чанг-Кай Шэка... Гэтыя арміі — яшчэ ня ўвесь кітайскі народ, якога „запасаў“ хопіць на барацьбу з сотняй Чанг-Тсо-Лінаў ды Чанг-Кай-Шэкаў. 400 мільённы народ толькі тады можа быць зламаны ды ізноў паняволены, калі сам зламае свой „дух“, адмовіцца ад барацьбы, пакорна прыме чужацкае ярмо ды — занепадзе духам... Але да гэтага ў Кітаі — яшчэ далёка...

У апошнія дні — ужо пасьля разгрому арміяў здрадніка Чанг-Кай Шэка — зварачаюць на сябе ўвагу ўсяго сьвету нейкія новыя цікаўныя праявы.

Першай праявай зьяўляецца поўны адыход ад справаў галоўнага здрадніка — Чанг Кай-Шэка. Як пішуць газэты, палітычная сьмерць былага павадыра народных арміяў выклікана страшэнным націскам левага крыла народнага руху.. Запраўды-ж: сама лёгіка здарэньняў кажа, што, калі правал народнай справы на фроньце стаўся перадусім у выніку разгрому левага крыла супольнага ўнутранага нацыянальнага фронту, дык першы крок дзеля направы гэтае справы — гэта адбудаваньне таго магутнага ўплыву лявіцы, які да здрады й разгрому даваў народнай справе вялізарныя пасьпехі на ваенным фроньце. І вось, выкінуўшы Чанг Кай-Шэка, правіца і цэнтр Куо-Мін-Тангу пачалі перагаворы з яго лявіцай („камуністамі“) ізноў аб адзіным фроньце... Газэты ізноў называюць імя радавага дарадцы Барадзіна, які ізноў быццам кіруе справай паразуменьня ды новай тактыкі супольнага народнага руху... Трэба сабе ясна прадставіць, якую пераваgу, якія вялізарныя ўплывы можа мець цяпер гэты радавы дарадца — пасьля разгрому Чанг-Кай-Шэка, які быў выкліканы якраз разгромам лявіцы Куо-Мін-Тангу, барацьбой з радавымі ўплывамі і наагул здрадай усей сацыяльнай ідэалегіі народнага руху ў Кітаі...

Апошнія весткі ясна кажуць аб наладжаным ужо супольным фроньце — ня толькі ваенным, але і ўнутрана-палітычным. На апошняй нарадзе генаралаў нанкінскай і ханькоўскай арміяў быў прысутны і радавы генарал Гален...

Трэба зьвярнуць увагу на тое, што ў барацьбе і разгроме Чанг-Кай Шэка прымаў вельмі далёкае ўчасьце ведамы „хрысьціянскі“ генарал Фэнг, які гэткім чынам мае зусім сьвежую, добра азброеную армію і можа пусьціць яе ў ход у кожны мамэнт... Гэты генарал Фэнг, як усе кітайскія павадыры, круціў шмат у часе ўсяе хатняе вайны, але бяз сумліву зьвязаны больш з лявіцай Куо-Мін-Тангу. Да таго ж для Чанг-Тсо-Ліна ён зьяўляецца страшэнным асабістым ворагам.

Гэткім чынам, бяручы ўсё вышэй сказанае пад увагу, трэба сказаць, што перамога на фроньце Чанг-Тсо-Ліна над Чанг-Кай-Шэкам — яшчэ не канец хатняй вайны, — яшчэ не перамога гэтага японскага найміта над народным вызвольным рухам у Кітаі. Людзей — барацьбітаў у вялізарным краі хопіць; хопіць, трэба думаць, у іх і жаданьня вызваленьня, ды патрэбнае дзеля гэтага энэргіі.

Нанкін узяты паўночнай арміяй.

Апошняя тэлеграма кажа аб узяцьці Нанкіна (сталіцы і галоўнай кватэры Чанг-Кай Шэка) — паўночнай арміяй Чанг-Тсо Ліна. Перадавыя атрады паўночнай арміі падыйшлі ўжо на 150 кілямэтраў да Шанхаю... У Шанхаі — вялізарная маса бежанцаў з Нанкіну. Спадзяюцца паўстаньня работнікаў ды захвату імі места. Але магчыма, што англійскія войскі — у апошні мамэнт — адкрыта ўмяшаюцца у барацьбу, скарыстаўшы з спрытнай тактыкі сваей дыпляматыі, скіраваўшай у „воўчую яму“ Чанг-Кай-Шэка...

Англійцы ўмяшаліся адкрыта ў хатнюю вайну.

Апошнія газэты прынесьлі вестку, што англійскае камандаваньне ў Кітаі ужо адкрыта ўмяшалася ў хатнюю вайну, захапіўшы значны адрэзак чыгункавай лініі Шанхай-Нанкін... Ясна, што гэтым англійцы згары забясьпечываюць сабе панаваньне над Шанхаем, які яны будуць бараніць проці за

хвату Чанг-Тсо-Лінам — пэўна-ж на падставе тайнай умовы з Японіяй...

Цікаўна, што дзеля гэтага захвату важнай стратэгічнай чыгункавай лініі англійскае камандаваньне, як заўсёды, скарысталася з вельмі „выгаднага выпадку". Справа ў тым, што англійскі ваенны аэраплян, залядзеўшы задалёка ад сваей базы ў мейсца распалажэньня паўдзённых арміяў, раптам—пэўна-ж выпадкова, але вельмі выгадна для англійцаў! — упаў ды разьбіўся. Англійцы патрэбавалі выдачы ім аэрапляну. Улады паўдзённай арміі выдалі матор, труп лётчыка, корпус самалёту. Але забыліся выдаць... крыльлі! Вось, прычапіўшыся да гэтых крыльляў, англійскі галоўны камандзір і выслаў „ультыматум" да паўдзённай арміі, якую якраз у гэты мамэнт страшэнна ціснуў Чанг-Тсо-Лін, — каб безадкладна (здаецца, — у немагчымы папросту тэрмін!) былі вернены самалётавыя крыльлі, інакш — англійскія войскі займуць чыгунку Шанхай-Кантон... Зразумела, што крыльлі ня былі „ў тэрмін" выданы, і чыгункавы шлях, які лучыць Шанхай з краем, быў перарэзаны англійскім войскам...

Ваеннае супрацоўніцтва Англіі з Японіяй — у захопленьні Кітаю — вырысавалася ўжо залішне выразна!

Амэрыка і ССРР.

Англія, атрымаўшы ад Амэрыкі ўсё, што ёй было патрэбна: зьмяншэньне ваеннага доўгу, стабілізацыю сваей валюты ды шмат чаго яшчэ,—здавалася, была самай шчырай саюзьніцай Злучаных Штатаў. Аднак, у патрэбны мамэнт, калі справа пайшла аб выкананьне Вашынгтонскай умовы, што загадывала Англіі зраўнаваць свой флёт з амэрыканскім — яна раптам пачала круціць. Уканцы, прыпертая да муру, Англія зусім сарвала паразуменьне з Амэрыкай ды перакінулася на бок ворага апошняй—Японіі. І вось з Японіяй Англія мае цяпер супольную марскую тактыку, скіраваную проці Амэрыкі, ды маніцца супольна дзяліць „дабычу ў Кітаі"— пасьля быццам ужо спыненай там хатняй вайны ды народнага вызвольнага руху.

Усё гэта страшэнна раздражніла Амэрыку, якая, апрача ўсяго іншага, мае свае вялізарныя інтэрэсы і ў Кітаі, ды зусім ня хоча гадзіцца на тое, каб там панавалі выключна Англія з Японіяй. А гэта змушае Амэрыку да шуканьня сабе таварыша-саюзьніка ў цяжкай барацьбе з магутнымі ворагамі.

Як ведама, толькі Амэрыка, Англія і ССРР, як наймагутнейшыя дзяржавы сьвету, вядуць запраўды сусьветную палітыку, калі ня лічыць асьмярожнай ды стрыманай Японіі і неразьвіўшай яшчэ ўсей сваей, падбітай вайной, сілы — Нямеччыны. Бо-ж Францыя занята толькі тым, каб — за ўсялякую цану—утрымаць тое, што мае, баючыся грознай для яе будучыны. Дык ясна, што шукаць сабе саюзьніка проці англійска-японскага саюзу Амэрыцы доўга ня трэба: гэткім саюзьнікам можа быць толькі той самы Саюз Сацыялістычных Радавых Рэспублік, які для Англіі зьяўляецца найбольш небясьпечным ворагам з усіх магчымых на сьвеце. Сілу ССРР у Азіі, як саюзьніка Амэрыкі проці Японіі, — таксама аценіць кожны. Дык, калі Амэрыка запраўды апыніцца ў такім стане, што пачуе японска-англійскія пазуры,—тады для яе няма іншай дарогі, як шлях паразуменьня ды навет зьбліжэньня з ССРР.

Пакуль-што яшчэ буржуазная Амэрыка кажа розныя прыкрыя рэчы ўраду ССРР, ня хочучы гадзіцца з „камуністамі" і т. п. Але-ж калісьці ня менш сацыяльна-палітычных супярэчнасьцяў было і між рэспубліканскай Францыяй і царскай Расеяй. Аднак жа „нямецкая небясьпека" пагадзіла іх, дый цалаваліся расейскі „помазанникъ Божий" з францускім прэзыдэнтам — нягорш, як родныя браты. Тое самае будзе і цяпер. Справа толькі ў тым, каб Амэрыцы запраўды англійцы цяжка наступілі на „любімы мазоль", як кажа прыказка.

Што спрытны радавы ўрад добра разумее ствараўшаеся палажэньне, аб гэтым ня трэба казаць. Мы ўжо маем дакладныя весткі аб цэлым радзе розных прапазіцыяў, зробленых Амэрыцы радавым урадам. Што амэрыканцы не астануцца „нячулымі" да такіх канцэсіяў, як вугальныя ці нафтавыя абшары на Сахаліне, або нафтавая ўмова, — аб гэтым таксама двух думак быць ня можа... Пачнецца, як заўсёды, з малога, але пасьля супрацоўніцтва двух вялізарных Рэспублік, маючых, паміма розьніцаў у сацыяльным ладзе, вельмі многа супольнага, можа разьвіцца ў нешта нячуванае яшчэ на сьвеце.

У кожным выпадку, калі што ёсьць запраўды цікаўнага ў сусьветным маштабе канкурэнцыі і супрацоўніцтве найвялікшых дзяржаваў сьвету, дык адносіны паміж такімі волатамі, як Амэрыка і ССРР, трэба паставіць на першым пляне. Будзем сачыць за кожнай праявай зьбліжэньня іх да сабе — з асаблівай увагай...

Падаткавая праграма ураду.

Міністар Скарбу Чэховіч у „гутарцы" з супрацоўнікам „Глосу Правды" выклаў праграму ўраду ў галіне рэарганізацыі падаткавай сыстэмы ў Польшчы.

Міністар заявіў, што несправядлівы ды руйнуючы маёнтковы падатак, які зьяўляецца не падаткам, але—канфіскацыяй маемасьцяў, будзе скасаваны больш, як напалову: з 1 мільярда—да 407 мільёнаў злотых. Міністар тлумача такую палёгку для заможных клясаў „недарэчнай будовай закону" аб гэтым 1 мільярдзе злотых падатку. Але слушна кажа „Роботнік", што думка ўраду зьменшыць маёнтковы падатак на 60% ня мае нічога супольнага з „будовай закону": гэта-ж папросту — падарунак польскім капіталістам, якія, праўду кажучы, і без таго не заплацілі падатку, ня гледзячы на існуючы закон...

Замест выкананьня „недарэчнага закону", урад мае ўвясьці маёнтковы падатак — як сталы, і гэты падатак маюць плаціць—ну, ведама-ж!—значна шырэйшыя колы падатнікаў капіталістаў, чым дагэтуль. Знача: ня толькі багатыя людзі, але й небагатыя. Ведама: багатым будзе лягчэй...

У далейшым п. міністар заявіў, што ўрад мае лепш падзяліць падаткі між дзяржаўным скарбам і самаўрадамі.

Усе гэтыя праекты ўрад мае перадаць на вырашэньне парляманту (але—ня гэтаму Сойму, а ўжо наступнаму!), бо сам урад — паводле дадзеных яму паўнамоцтваў—ня мае права зьмяняць падаткі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Гандлёвы балянс Польшчы ўсьцяж пасыўны.

Гандлёвы балянс Польшчы за ліпень ізноў выявіў значную перавагу прывозу ў край над вывазам з краю за граніцу. Гаспадарчы дэфіцыт краю за ліпень — 22 з чвэрцяй мільёнаў злотых у золаце (па залатому роўню—5,18 за даляр, але па бягучаму курсу—амаль не ўдвая больш). Як ведама, за чэрвень гэты гандлёвы недахоп быў яшчэ большы—амаль не ўдвая.

Зьезд урадоўцаў.

У „гіерархічнай" Польшчы найцяжэй жывецца якраз ніжэйшым урадоўцам, а вышэйшым дык можна толькі пазайздросьціць. Дык вось, гэтыя ніжэйшыя пастанавілі выслаць дэлегатаў на агульны зьезд, які і адбыўся ў Варшаве 14 жніўня. Зьезд гэты прыняў рэзалюцыю, у якой пратэставаў проці дробных дадаткаў, дадзеных на падставе апошняга ўрадавага загаду. Дэлегаты ўсяго рэпрэзэнтавалі армію ў 150 тысячаў гэтых ніжэйшых працаўнікоў.

„Хваляваньне сярод безработных".

Перадрукоўваем без усялякіх зьменаў з „Роботніка" заметку пад вышэй паданым загалоўкам.

„Распараджэньне ўраду, якое пазбаўляе дапамогаў нежанатых ды жанатых бяздзетных безработных, выклікала ў-ва ўсіх вугальных абшарах вялізарнае хваляваньне („вжэне") сярод безработных. Безработныя пачалі зьбірацца масава перад гмахамі Саюзу Гарнякоў, староствамі ды магістратамі, дамагаючыся працы ці павароту ізноў дапамогаў.

Сэкрэтарыят Саюзу Гарнякоў зьвярнуўся да акружных сэкрэтарыятаў, каб тыя склікалі канфэрэнцыю дэлегатаў безработных—дзеля абгавору спосабаў павароту назад засілкаў для безработных, пакуль урад, магістраты ці соймікі не дадуць безработным працы.

На канфэрэнцыях, якія адбыліся ў панядзелак і аўторак, прыняты рэзалюцыі і выбрана дэлегацыя, якая — пад старшынствам п. Станьчыка—мае выехаць у Варшаву, каб прадставіць ураду (магчымыя) пасьледзтвы няўдалага яго распараджэньня".

Новы канфлікт між вуглякопамі і прамыслоўцамі.

„Роботнік" паведамляе аб новым канфлікце між вуглякопамі і ўласьнікамі вугальных капальняў Дамброўскага раёну. Прамыслоўцы адкінулі дамаганьні работнікаў—аб падвышцы платы. Тады адбылася канфэрэнцыя дэлегатаў Дамброўскага раёну разам з урадавай Цэнтральн. Каміт. Саюзу Гарнякоў.

Канфэрэнцыя пастанавіла пакуль-што не абвяшчаць забастоўкі, але перад тым спробаваць пашукаць помачы ў ураду... У Варшаву мае быць у нядзелю 21/8 — выслана дэлегацыя паўнамоцнікаў Дамброўскага і Кракаўскага раёнаў. Калі ўрад адмовіцца націснуць на прамыслоўцаў, тады мае ізноў сабрацца канфэрэнцыя, якая ўжо паставіць рубам справу абвяшчэньня забастоўкі...

Да справы ген. Загурскага.

Польская і заграiнчная прэса называе дзіўную прапажу бяз сьледу ген. Загурскага—скандалам. Правая прэса, баючыся проста вінаваціць „пілсудчыкаў" у нейкай расправе з ген. Загурскім, пускае найдзіўнейшыя чуткі аб лёсе схаванага ці „пахаванага", а мо' проста — схаваўшагася генарала...

Цэлы тыдзень ўрад маўчаў, слухаючы гэткія розныя дамыслы, ды толькі канфіскаючы газэты за нязгодныя з праўдай весткі. Пасьля выдаў камунікат, з якога вельмі мала што выясьнілася. Пасьля варшаўскія ўлады папрасілі сталічныя газэты нічога ня пісаць аб ген. Загурскім, бо ўлады ўжо „напалі на сьлед генарала",—дык—каб не пашкодзіць паляваньню, хай не палохаюць зьвярыны... Аднак-жа і пасьля гэтага ўрадавыя „бутэрбродныя" газэты паведамілі, што ўлады дагэтуль не знайшлі нічагусенькі, але-ж моцна спадзяюцца, што — „час урэшце выкрые ўсё"...

Незалежная прэса слушна абураецца на гэткае бяссільле ўрадавага апарату, які, здаецца, „мае перадаць сьледзтва ў справе прапажы генарала Загурскага—часу"... Запраўды-ж—вельмі выгадны „сьледчы судзьдзя".

„Роботнік" так і піша: „ствараецца ўражаньне, што ўрад—на злосьць прэсе—робіць высілкі, каб абярнуць гэтую справу — ў багатэлю"...

Канфіскаты сыплюцца на прэсу.

У апошнія дні асаблівы ўраджай на канфіскаты газэт у Варшаве і на правінцыі. Ізноў сканфіскавана эндэцкая „Газ. Варшавска"—за артыкул аб прамове марш. Пілсудскага ў Калішу, і краўскі „Глос Народу" — за арт. аб ген. Загурскім.

„Прэсавы дэкрэт" сьпяшаецца пажыць у ва ўсю; відаць,—перад сьмерцяй. — Бо ж Сойм спрабуе ў першыя-ж дні скасаваць яго ізноў...

Бітва афіцэраў з шофэрамі.

Польскія газэты расказываюць аб скандальнай бітве вышэйшых афіцэраў з шофэрамі ў Перамышлю. Група афіцэраў з палкоўнікам 1 палка танкаў на чале выйшла з нейкага „кафэ" дый пачала садзіцца ў аўтамабіль. Шофэр заявіў, што ўсіх разам аўтамабіль ня зьмесьціць. Афіцэры пачалі спрачацца, а адзін з іх сам п. палкоўнік, кінуўся да шофэра біцца — „ў пыск"... Шофэр даў здачы... На помач палкоўніку кінуліся афіцэры, на помач шофэру — стаяўшыя каля „кафэ" таварышы ягоныя. Афіцэры, выняўшы кінжалы, кінуліся наўцекі ды схаваліся пад касьцёл рэфарматаў, дзе і пачалася агульная баталія. Навакол баталіі сабралася вялізарная таўпа. Урэшце зьявілася паліцыя, войска, староста і камэндант места, якім з трудом удалося спыніць запраўдную вайну шофэраў з панамі афіцэрамі, у выніку пабоішча—некалькі цяжка і лёгка раненых з абодвух бакоў... Сьледзтвам кіруе сам камандзір ваеннага округу...

Заграніцай.

Літоўскі прэм'ер аб адносінах з Польшчай.

Літоўскі прэм. Вальдэмарас—у гутарцы з журналістам—з прычыны кампаніі ў польскай прэсе на карысьць паразуменьня з Літвой заявіў:

„У Польшчы цяпер вельмі многа гаворыцца ды пішацца аб узнаўленьні нармальных адносінаў з Літвой. Гэта—добра. Але было-б значна ляпей, калі-б—замест пісаніны—Польшча выступіла-б з якімі-небудзь рэальнымі прапазіцыямі літоўскаму ўраду ў справе паразуменьня. Літва ніколі не адмаўлялася распачаць перагаворы. Новы літоўскі ўрад панавіў гэтую сваю добрую волю ў вельмі выразнай форме. Але з польскага боку ніякіх канкрэтных крокаў мы ня бачым"...

Сэрвітуты.

2.

Да сёлетняга году абавязковымі былі ў справе сэрвітутаў законы, выданыя Соймам— для г. зв. „Конгрэсувкі" 7 мая 1920 г. (Dz. U. R. P. Nr. 42, poz. 249) і 7.IV—1922 г. (Dz. U. R. P. Nr. 30 poz. 239 і Nr. 35 poz. 304); а для „Усходніх Зямель", г. зн. для большай часткі беларускіх і ўкраінскіх паветаў у Польшчы, 10.I. 1922 г. (Dz. U. R. P. Nr. 10, poz. 65). У скобках паказаны нумары дзяржаўных часопісяў, у каторых гэныя законы былі надрукованы.

Сёлета Прэзыдэнт Рэчыпаспалітай — на падставе атрыманых ад Сойму паўнамоцтваў —вышэйпералічаныя законы скасаваў і выдаў другія: для „Конгрэсувкі"—1.II. 1927 г. (Dz. U. R. P. Nr. 10, poz. 74) і для „Усходніх Зямель" — 1. II. 1927 г. (Dz. U. R. P. Nr. 10, poz. 750).

Перш-на-перш абгаворым гэты апошні закон для „Крэсаў", бо ён абыймае 4/5 беларускага грамадзянства пад Польшчай. Потым апішам і галоўныя пункты загаду для „Конгрэсувкі", бо ў сучасныя яе граніцы палякі ўпісалі шмат чыста беларускіх паветаў.

Новы прэзыдэнцкі закон розьніцца ад скасаванага соймавага ў большасьці пунктаў на карысьць паноў, у некатарых — і на карысьць сялян. Цяжэйшы для нашых беларускіх сялян прэзыдэнцкі закон тым, што: 1) ён вызначае лішне кароткія тэрміны дзеля прымусовай ліквідацыі сэрвітутаў і 2) узмацняе пры прымусовай ліквідацыі ўладу земскіх урадоўцаў, каторыя ў сучасных абставінах найчасьцей бароняць інтарэсы паноў.

Маленькай палёгкай гэтага закону для сялян ёсьць пункты 37, 38 і 39, у каторых вызначана, скольки зямлі ці пасекі за сэрвітут належыцца сялянам: у даўнейшых законах сяляне маглі атрымліваць толькі чацьвертую часьць надзельнай зямлі, хоць ім належалася й шмат болей; у цяперашнім-жа законе на большых сэрвітутах сяляне могуць атрымліваць палавіну, цэлы надзел, а то ў два разы болей зямлі, як маюць надзельнай.

Другой важнейшай для беднага сялянства палёгкай цяперашняга закону ёсьць п. 48, каторы забараняе дзяліць усе сумежныя вясковыя землі на надзельныя ўчасткі (прапорцыянальна) і дазваляе дзяліць іх на нумары ў вёсцы (на роўныя часьці). Калі-ж багацейшыя гаспадары ня згодзяцца, каб уся агульная вясковая ўласнасьць была падзелена роўна на ўсіх самастойных жыхароў вёскі (не выключаючы батракоў, мікалаеўскіх салдатаў і каморнікаў), дык п. 48 пастанаўляе, што ня менш паловы вясковай агульнай уласнасьці мусіць дзяліцца на нумары, а другая палова можа быць падзелена і прапорцыянальна.

Ніжэй падаем зьмест усіх галоўных пунктаў гэтага „загаду Прэзыдэнта Рэчыпаспалітай з 1. II. 1927 г. аб скасаваньні сэрвітутаў у ваяводзтве валынскім, палескім, наваградзкім, віленскім і ўсходняй часьціні ваяводзтва беластоцкага":

I. 1. На аснове гэтага загаду касуюцца дабравольна або прымусова ўсе сэрвітуты, якія існуюць у выніку зямельнага ўстройства сялян і зямляробаў, зраўнаных з сялянамі.

2. На аснове гэтага загаду дзеліцца плата за скасаваныя сэрвітуты, дзеляцца супольныя выганы, лясныя сенажаці і пасьвішчы ў супольным карыстаньні і робяцца замены ніваў у сувязі з касаваньнем сэрвітутаў.

II. Доказам існаваньня сэрвітутаў, якасьці іх (паша, дровы, ягады ці вада або рыба) і велічыні зьяўляецца запіс у дадзенай крэпасьці, ці ў іншых дакумантах.

Староны.

III. 1. Прадстаўнікамі сялян-сэрвітутнікаў мусяць быць прадстаўнікі ўсіх самастойных гаспадарак.

2. Самастойнай лічыцца гаспадарка аддзельная, якая самастойна аплачывае падаткі.

3. Прадстаўніком гаспадаркі ёсьць гаспадар уласнік.

4. Калі ўласнікаў гаспадаркі некалькі, мусяць яны выбраць аднаго спасярод сябе; калі не пагодзяцца і ня выбяруць, дык прадстаўніком лічыцца найстарэйшы ў хаце.

5. Калі сэрвітут належыцца гміне або грамадзе (напр. да вясковай школы), дык прадстаўніком лічыцца войт або солтыс вёскі.

6. Пералічаныя ў гэтым пункце прадстаўнікі выступаюць пры ліквідацыі сэрвітутаў без асобных паўнамоцтваў.

IV. 1. Сяляне сэрвітутнікі вядуць ліквідацыю сэрвітуту самы толькі тады, калі ёсьць іх толькі трох; калі-ж сялян (самастойных гаспадароў) болей, мусяць яны выбраць ад сябе паўнамоцнікаў — ня болей, як трох.

2. Паўнамоцнікі гэныя выбіраюцца на вясковых сходах. Кожын прадстаўнік самастойнай гаспадаркі мае на сходзе адзін голас, або столькі галасоў, ад скалькіх самастойных гаспадарак ён выбраны.

3. Склікае сход і мусіць быць старшынёю на ім войт або солтыс, каторыя ня маюць права галасаваць на сходзе, калі не зьяўляюцца прадстаўнікамі самастойных сэрвітутных гаспадарак. Сход можа склікаць земскі камісар, або яго памоцнік, каторы з ураду тады і старшынствуе на сходзе.

4. Сход важны ў прысутнасьці прадстаўнікоў ня менш, як паловы ўсіх сэрвітутных самастойных гаспадарак.

5. Пастановы сходу абязываюць пры звычайнай большасьці галасоў прысутных на сходзе. Зьмест пастановы мусіць выразна азначаць межы даных сходам паўнамоцтваў.

6. Кожны прадстаўнік самастойнай сэрвітутнай гаспадаркі можа на словах ці на паперы зажадаць ад солтыса скліканьня сходу; солтыс мусіць такое жаданьне прадстаўнікоў ад гаспадарак выканаць у 3 дні, а жаданьне земскага камісара — у вызначаны ім час.

V. 1. Ад двара, на каторым вёска мае сэрвітут, выступаць можа ўласьнік асабіста ці праз свайго ўпаўнаважненага.

2. Калі двор належыць да некалькіх уласьнікаў, выступаць павінен найстарэйшы з іх, або ўпаважнены ўсімі іншымі ўласьнікамі.

3. Упаважненьне мусіць быць пацьверджана натарыусам, гмінай, або староствам.

4. Калі двор, ад каторага вёсцы належыцца сэрвітут, падзелен больш як паміж траіх уласьнікаў, то мусяць яны для ліквідацыі выбраць, так як і вёска, ня больш, як трох упаважненых.

VI. 1. Калі сэрвітут належыцца ад ураду ці для ўраду, то прадстаўніком яго пры ліквідацыі мусіць быць тая ўлада, пад каторай сэрвітутная зямля знаходзіцца. Ад зямлі, каторая знаходзіцца пад загадам вайсковай улады, прадстаўніком будзе Міністэрства Зямельных Рэформаў.

2. Калі належная для ўраду зямля ня варта больш, як 100.000 зл., урад можа яе прадаць.

VII. Асобы, каторых пакрыўдзяць пастановы сходаў вясковых сэрвітутнікаў, ці зямельных уласьнікаў, маюць права да сямі дзён апэляваць праз павятовага земскага

Казьні польскіх шпіёнаў у Літве.

Ваенны суд у Коўне засудзіў на сьмерць трох палякоў, абвінавачаных у шпіёнстве. Адначасна засуджана адна кабета-полька на 4 гады турмы—за тое ж.

Літоўскі суд засудзіў абвінавачанага ў шпіёнстве на карысьць Польшчы нейкага Аляксандра Грэчку на сьмерць. Просьба аб памілаваньні адкінута Прэзыдэнтам, і вязень 15 жніўня расстраляны.

Кару сьмерці для Бяляўскага прэзыдэнт замяніў на вечную катаргу, Шумоўскаму — на 20 гадоў турмы.

Ізноў Англія круціцца каля Балтыцкага мора...

Нядаўна, як ведама, балтыцкія парты „візытавала“ англійская марская эскадра, што выклікала страшэннае абурэньне ў СССР, як яўная дэманстрацыя проці Радаў. Як ведама, англійскі ўрад неяк „паразумеўся“ з урадам Даніі — у справе падрыхтаваньня „паўночных Дарданэлаў“ (—так называюць вузкія ды няглыбокія праходы — праліВы з Нямецкага ці Паўночнага мора — у Балтыцкае: Зунды). Данскі ўрад зьнекуль „знойдзе“ грошы дзеля паглыбленьня гэтых Зундаў, каб праз іх маглі прайсьці найвялікшыя караблі... англійскага флёту—у Балтыцкае мора...

Чаму гэта раптам справай праходу англійскага флёту заінтэрасаваўся данскі ўрад, гэта-ж — адна з тайнаў шляхотнага „міратворца“ Чэмбэрлена...

Цяпер ізноў англійскі ўрад дражніць публічную апінію СССР — візытай сваей эскадры найвялікшых гідраплянаў у-ва ўсе балтыцкія парты, пачынаючы ад сталіцы Нарвэгіі Осло — аж да Гэльсінгфорсу (сталіца Фінляндыі), дзе гэтая эскадра мае забавіцца даўжэйшы час. Што англійская эскадра мае ваенна-палітычныя заданьні, відаць хаця-б з таго, што на чале яе стаіць сам міністар авіацыі.

Сэнсацыйная заява сэнатара Жувэнэля.

Сэнатар Жувэнэль, які толькі-што зрабіў сэнсацыю сваім дэманстрацыйным выхадам з складу французскай дэлегацыі ў Лізе Народаў, зганіўшы адначасна ў сваей заяве і гэтую Лігу і Французскую ў ёй палітыку Брыяна, прадаўжае ўсьцяж рабіць далейшыя сэнсацыі. Ен заявіў, што належыць да тых людзей, якія падтрымліваюць распачатую лёрдам Ротсэрмэрам акцыю — на карысьць перагляду мірнага Трактату, што рэгулюе палажэньне Вэнгрыі...

Як ведама, Францыя якраз падтрымлівае ворагаў Вэнгрыі ды „непахільнасьць і непарушнасьць існуючых трактатаў“. Дык заява былага дэлегата Францыі ў Лізе выклікала вялікае абурэньне ў краі... Сэн. Жувэнэль дадаў, што рух на карысьць перагляду трактату ў Трыянон („умова“ дзяржаваў — пераможцаў з Вэнгрыяй) мае ўжо ў Англіі вялізарную сілу, з якой лічыцца і англійскі ўрад, пакуль-што хаваючыся дыпляматычна за гэтага лёрда Ротсэрмэра, магутнага „прэсавага караля“... Трэба лічыцца з гэтым рухам і Францыі. Каб супакоіць Францыю ды яе заінтэрасаваных у паняволеньні Вэнгрыі васалаў — пастаўленых Антантай жандармамі над Вэнгрыяй, Жувэнэль дадаў, што перагляд павінен перадусім вырашыць справы гаспадарчага адраджэньня Вэнгрыі. Што-ж датычыць зьменаў граніц Вэнгрыі (—а гэта якраз — найбольш дражлівая справа для суседзяў яе!), — дык яны пэўна-ж былі-б нязначныя...

Можна зразумець, што падтрыманьне Вэнгрыі Англіяй і Італіяй б'е крэпка па ўсей „Французкай гэгемноіі“ (панаваньню) на Балканах, дзе дагэтуль панавала непадзельна пакорная Францыі Малая Антанта...

Таргозы трактат між Францыяй і Нямеччынай.

Зусім неспадзявана падпісана ў Парыжу торговая ўмова між Нямеччынай і Францыяй, перагаворы аб якой цягнуліся значны час без рэзультатаў.

Нямецкая прэса, за выключэньнем нездаволеных нацыяналістаў-абшарнікаў, нагул лічыць умову, хоць і не спаўняючай усіх дамаганьняў Нямеччыны, але карыснай. Французская прэса таксама здаволена дагаворам, які так доўга і скандальна цягнуўся, ніяк не даходзячы да жыцьця.

Усё кажа за тое, што — за гаспадарчыя ўступкі з боку Нямеччыны—Францыя заплаціла палітычнымі ўступкамі ў справе рашучага зьмяншэньня акупацыі.

Хаця французская прэса падае ўсялякія весткі аб тым, быццам французскі ўрад — у паразуменьні з англійскім і бэльгійскім — згадзіўся вельмі мала зьменшыць акупацыйныя войскі (—штосьці ўсяго на 5 тыс., а разам з Англіяй і Бэльгіяй—па 1.000—зьменшана будзе акупацыя толькі на 7.000 жаўнераў),—трэба думаць, што ў запраўднасьці паразуменьне з Нямеччынай было для апошняй значна больш карысным і ў галіне гэтай найважнейшай для яе справы.

Падпісаньне французска-нямецкай умовы напярэдадні верасьнёвага Агульнага Збору Лігі Народаў кажа аб тым, што абодва краі паразумеліся ізноў у галоўных сваіх спорных справах і вострa выступаць перад Лігай адзін проці аднаго ня будуць.

Парыжскія газэты пішуць, што кампраміс у справе зьмяншэньня акупацыі зьдзейсьнены, у значнай меры дзякуючы ўплывам на Францыю і Бэльгію з боку Англіі. Быццам Англіі — побач з Брыянам — прышлося вынясьці страшэнную барацьбу з генараламі французскага штабу, якія ў апошні мамэнт— уступілі...

Пішуць газэты, што апрацаваны кампраміс хаваецца пакуль-што ў сакрэце, дый што перагаворы ў справе акупацыі хутка распачнуцца ў Парыжу ці ў Бэрліне.

Нямеччына трэбуе звароту ёй калёніяў.

Нямецкі ўрад пастанавіў дамагацца звароту Нямеччыне яе былых калёніяў у цэнтральнай Афрыцы—Того і Камэруна. Як ведама, цяпер мае „мандат“ на ўпраўленьне гэтымі калёніямі Францыя, якая адмаўляецца вярнуць Нямеччыне гэтыя абшары, хаця ў іх немцы ўлажылі шмат капіталу.

Немцы ня хочуць гандлёвай умовы з Польшчай.

Як ведама, польска-нямецкая торговая ўмова—пасьля распачацьця гаспадарчай вайны між абыдвума краямі за часоў Грабскага — ніяк ня хоча ўзнавіцца. Немцы трэбуюць выразна палітычных уступак, польскі ўрад адцягае іх у працягу ўжо некалькіх гадоў. Здавалася, што ў апошнія часы паразуменьне неяк — наладжвалася. Але вось, толькі-што нямецкі ўрад запрапанаваў увайсьці ў склад новай камісіі, якая апрацавалабы падставы для торговай умовы з Польшчай, цэламу раду паслоў нямецкага парляманту, спэцыялістаў у розных галінах эканамічнага жыцьця. І вось тры паслы-нацыяналісты — адмовіліся ад уваходу ў гэткую камісію, заявіўшы, што ня пойдуць дзеля таго, што—„умова з Польшчай ня мае ніякае надзеі быць падпісанай“...

Кажуць газэты, быццам адмова зроблена—па камандзе павадыра нямецкіх нацыяналістаў гр. Вэстарпа...

Балканскі „сьвяты трайны саюз“...

Як ведама, напалеонаўскія войны расхісталі шмат тронаў у Эўропе, бо Напалеон „гуляў з каралямі, як з гарэхамі“, перасыпаючы іх з рукі ў руку, раскусываючы ці кідаючы чарвівыя на зямлю. Вось-жа тры наймагутнейшыя манархі Эўропы зрабілі „сьвяты трайны саюз“, які меў мэтай „абараніць ды ўкрапіць падставы рэлігіі, маралі і... манархізму“ ў сьвеце...

Нешта падобнае, здаецца, пастанавілі зрабіць у Балканскай „Эўропе“ тры астаўшыяся там каралі: Югаслаўскі, Баўгарскі ды Румынскі... Праўда, апошняга „замяшчае“ пакуль-што „праклятьі“ бацькай прынц Кароль.—Тры гэтыя манархі зьехаліся ў нямецкім месьце Мюнхене на нараду, на якой маюць апрацаваць гэткі „сьвяты“ саюз (папросту: прафэсіянальны)... узаемнай аховы манархаў ад усялякай небясьпекі...

На гэтай нарадзе баўгарскі і югаслаўскі каралі прасілі прынца Караля румынскага, каб ён не рабіў перашкодаў для панаваньня... „6 ці-гадовага“ манарха румынскага Міхася І... Каб украпіць „саюз каралёў“, пастановілі баўгарскага караля Барыса ажаніць з румынскай прынцэсай Ілеанай...

Цікаўна, што гэтыя запраўдныя каралі ўсё-ж такі лічаць „сваім“ і выгнанага з краю ды пазбаўленага трону прынца Караля. Гэта, пэўна-ж, дадасьць апошняму ахвоты — да „павароту да кахаючага яго народу“...

Урадавы крызіс у Ірляндыі.

Ірляндзкі ўрад Козгрэва, які прадстаўляў партыі, што стаяць на груньце паразуменьня з Англіяй (прызнаньня супольнага караля і т. д.), раптам захістаўся. Справа ў тым, што група паслоў незалежнікаў-рэспубліканцаў з сваім павадыром дэ-Валерай пастанавіла прыняць учасьце ў працах парляманту, які яна дагэтуль байкатавала. Гэтая група, паразумеўшыся з работніцкімі пасламі ды падлічыўшы галасы праціўнікаў ураду, знайшла, што, увайшоўшы ў Сойм, яна можа зваліць урад ды ўзяць уладу ў свае рукі.

16 жніўня адбылося рашучае паседжаньне парляманту, на якім работніцкі пасол зрабіў прапазіцыю—выразіць недаверые ўраду Козгрэва. Усе былі перакананы, што прапазіцыя зьбярэ большасьць. Але тым часам падлічэньне галасоў выявіла роўнасьць галасоў за і проці ўраду. Тады старшыня падаў свой голас за ўрад, і гэткім чынам фармальна ўрад быў адратаваны...

Але ў запраўдных дэмакратыях урад, маючы большасьць 1 голасу ў парляманьце, ніколі ня хоча аставацца. — Дык—у выніку маральнага паражэньня ў Сойме—ірляндзкі ўрад ўсё-ж мае выйсьці ў адстаўку, і ўрадовыя партыі маюць распачаць перагаворы з рэспубліканцамі-незалежнікамі — у справе коаліцыі...

Коаліцыя гэтая аблягчаецца тым, што незалежнікі дэ-Валеры — дзеля тактычных меркаваньняў (каб увайсьці ў склад Сойму) —згадзіліся прысягнуць на вернасьць англійскаму каралю, ад чаго дагэтуль адмаўляліся. А гэта „фармальная“ прысяга робіць ужо магчымасьць далейшых крокаў на шляху кампрамісу з Англіяй, ды з прыхільнікамі пэўнай сувязі Ірляндыі з Брытанскай Імпэрыяй...

* * *

Я гляджу на сьвет вачыма паэта,
І мой буйны верш зіхаціць агнём...
І па ім ліецца, нібы водклік сьвета,
Радасьці і шчасьця нястрыманы тон.
Я пайду далёка, гой, за тое поле
На сустрэчу новым, яркім, сьветлым дням,
І рой буйных песень аб шчасьлівай долі
Брызьне, разьліецца на грудзі палям.

* * *

Сіняе, сіняе неба,
Хмарак кудравенькіх рады,
Радасьцю поўныя грудзі, —
Я хачу вершы стварацъ.
Зьнекуль, здалёк, у прасторы
Прагырміць гулкі гул,
Зноў шумам места я хворы...
Быццам як сомнабул,
Бачу я Вільні завулкі
У зьзяючых іскрах сьвятла...
Я часта рабіў там прагулкі,
Шукаючы сэнсу жыцьця.
Сьняцца мне бледныя твары,
З адбіткам штодзенных клапот.
Газэтчыкі... крамы... тавары...
І брудны рабочы капот.

* * *

Часамі ў душы маёй дзіўнай мэлёдыяй
Пышныя кветкі цьвітуць...
Гэта час, калі ціхія сумныя,
Свой адвечны праходзячы пуць,
Зоры ў прасторную муць
Таюць... плывуць...
Гэта час, калі журбаю хворы я,
Калі сэрца так соладка тае,
І, хапаючы згукі сусьветныя,
Чалавецтва усё абымае...
І, як вечар фарбы ў маі,
Тае... тае...

Лукішкі 1927 г. **Хв. Ільяшэвіч.**

Яшчэ рэзультаты канфэрэнцыі ў справе „разбраеньня на моры“.

Прэзыдэнт Кулідж зацьвердзіў бюджэт Злучаных Штатаў у суме 3 мільярдаў 317 мільён. даляраў.

Бюджэт прадбачыць вельмі значныя выдаткі на павялічэньне марского і паветранага флётаў Амэрыкі. За першыя 5 гадоў мае быць набудавана 1900 новых ваенных аэрапляНаў. Марскі бюджэт Амэрыкі, пачынаючы ад 1932 г., мае быць найвялікшым у сьвеце.

Хай-жа цяпер сунецца разваліваючаяся гаспадарча Англія—з сваей канкурэнцыяй з Амэрыкай!..

Новы грэцкі ўрад.

Новы габінэт у Грэцыі злажыў ведамы п. Заіміс. У склад ураду ўвайшлі найбольш ведамыя палітыкі Грэцыі — павадыры ўсіх партыяў, за выняткам толькі „популістаў“— ці людоўцаў.

Арышты ў Бэсарабіі.

Румынская паліцыя выкрыла быццам вялікую арганізацыю шпіянажу на карысьць СССР. Арыштаваны 59 асоб.

камісара да акружнай земскай камісіі, пастанова каторай аканчальная.

VIII ы пункт гавора аб абавязковым паведамленьні аб ліквідацыі сэрвітуту тых асоб, каторыя пазычылі ўласьніку сэрвітутнай зямлі грошы, забясьпечаныя гіпотэкай (даўней называлі гэты ўрад старшым натарусам).

IX-ы пункт устанаўляе парадак даручаньня ўсялякіх папераў, павестак і пастаноў у сувязі з ліквідацыяй сэрвітуту: усе паперы мусяць быць даручаны праз гміну; калі папера належыцца пану, дык мусіць паквітаваць атрыманьне ён сам, або яго жонка, ці хто з сям'і—калі-ж паперы адрэсаваны да сэрвітутнікаў-сялян, то іхнім імем квітуе каторы-небудзь з вясковых упаважненых.

X. Пры частковым касаваньні сэрвітутаў (калі напр. з некалькіх вёсак, што маюць сэрвітут на тым самым двары, касуецца сэрвітут толькі аднэй вёскі) можна выдзяліць для тэй вёскі часьціну сэрвітутнай плошчы на ўласнасьць — толькі пад тым варункам, каб іншыя сэрвітутнікі ня былі пакрыўджаны. Пастанова ў гэтым пытаньні можа быць выдана павятовым камісарам.

XI. 1. Калі маёнтак, на каторым сяляне маюць сэрвітут, цяпер належыць да некалькіх уласьнікаў (паны падзяліліся, ці асаднікаў пасадзілі), часьціна, належная сялянам за сэрвітут, мусіць быць выдзелена ад тых панкоў ці асаднікаў, у валаданьні якіх сэрвітутная зямля знаходзіцца.

2. Калі каторы панок ці асаднік будзе пры тым пакрыўджаны, што з свае часьціны аддаў плату за сэрвітут, які вёска мела на цэлым двары,—дык можа ён даводзіць свае крыўды ад тых сваякоў ці асаднікаў, каторыя па сэрвітут з сваіх дзялянак нічога не далі.

3. Пры такім падзеле сэрвітуту ня могуць быць таксама пакрыўджаны сяляне-сэрвітутнікі тых вёсак, якія свайго сэрвітуту адначасна не касуюць.

Увага: Як бачыце, сялянскія сэрвітутныя правы ня могуць прапасьці пры жадным падзеле ці прадажы двара, ад якога сэрвітут належыцца. Сяляне маюць сэрвітут не ад уласьніка, а па зямлі, і дзеля таго сэрвітут іхні таксама ня можа ніколі прапасьці, як не прападае зямля. Паны ці асаднікі, што падзялілі паміж сабою двор, на якім сяляне мелі сэрвітут, калі гавораць, што сялянскія правы прапалі, дык кажуць няпраўду. Сяляне не павінны лёгка сваіх правоў уступаць і маюць права пасьвіць, як пасьвілі даўней, да падзелу двара.

XII. 1. Пастановы ў справах, абнятых гэтым загадам, выдаюць акружныя земскія камісіі на яўных (адкрытых для публікі і старон—у в а г а р э д.). паседжаньнях.

2. Пастанову акружнай земскай камісіі можна абжалаваць да 30 дзён праз старшыню акружнае земскае ўправы да галоўнай земскай камісіі.

3. Члены земскіх камісіяў, на жаданьне старон мусяць быць выключаны з паседжаньняў у справах, у каторых яны самы, ці іх блізкія сваякі, заінтарэсаваны.

XIII. Як акружная, так і галоўная земская камісіі ня маюць права дзяржаць атрыманых сэрвітутных спраў больш, як па два месяцы.

Гэтым пунктам канчаецца ўступная часьць загаду аб касаваньні сэрвітутаў,—т.-зв. „дзял“ першы.

Далейшыя часьціны („дзялаў“ усіх 7) і пункты (ўсіх 62) гавораць аб дабравольнай ліквідацыі сэрвітутаў, прымусовай і аб падзеле супольных зямель паміж сялянамі.

Янка Жыжмянскі.

ХРОНІКА.

З курсаў польшчыны. Наладжаныя ў Радашкавічах Т-вам Беларускае Школы курсы польшчыны ўжо закончыліся. Курсы трывалі ад 1-га жніўня да 20-га жніўня. На іх выкладалася польская мова, літэратура, гісторыя і навука аб сучаснай Польшчы. Праслухаўшы гэтыя курсы вучыцялі беларускіх гімназіяў у працягу зімы будуць мець магчымасьць дапоўніць сваю веду самастойнай працай, а на лета праектуецца прадоўжаньне курсаў, каб ужо мець магчымасьць здаць экзамены пры ўрадавай камісіі.

Слухалі курсы 22 вучыцялі беларускіх гімназіяў—віленскае, радашкоўскае і клецкае.

Сварка між „полёнофіламі“. Паміж „полёнофіламі“ Умястоўскага і „полёнофіламі“ Павлюкевіча — узгарэлася праўдзівая вайна. Умястоўскі абвінавачывае Павлюкевіча ў тым, што ён і ўся ягоная кампанія — гэта-ж расейцы, якія адно толькі гуляюць у „беларусаў — полёнофілаў“, а запраўды стаяць за „единую, недѣлимую Россию“ (Кавэрда). Ізноў-жа Павлюкевіч кажа, што Умястоўскі і ягоныя супрацоўнікі—гэта проста нанятыя палякамі за грошы людзі, якія ня могуць прадстаўляць беларускую грамадзкую „полёнофільскую“ думку....

Найцікаўней у гэтай спрэчцы тое, што ні адна, ні другая старана запраўды-ж ня мае ніякага права прамаўляць ад імя беларускага народу, і „ў пылу споркі“ абедзьве староны гэта вельмі трафна даводзяць. Дык для беларусаў вывад тут—адзін: абое рабое! А што слугі аднаго пана сварацца, дык гэта затым, што кожын хоча ў вачох ягоных быць лепшым за другога і... заслужыць на багацейшы „паёк“!

Чарговая сэнсацыя. Абшарніцкае „Слово“ ў нумары з 20-га жніўня пад загалоўкам „Пасол Рагуля ў полёнофільскім лагеры“ падае запраўды-ж сэнсацыйную, ды на наш пагляд—непадобную да веры вестку, быццам пасол Рагуля (з ярэмічава-ксяндзоўскага „Сельсаюзу“) перакінуўся да полёнофільскае арганізацыі — „Рады“ Павлюкевіча. Туды-ж быццам павярнуў аглоблі і „тоже бѣлороссъ“ сэнатар Назарэўскі.

Падаючы гэту вестку „Слова“, мы аднак-жа будзем чакаць зяпярэчаньня абодвух гэтых паноў і толькі тады, калі-б такога ня было, удзелім гэтай справе больш увагі: калі-б гэта была праўда, дык з яе можна было-б зрабіць шмат цікаўных вывадаў....

„Смычка“ йдзе далей! Толькі-што вышаў з друку № 1 органу „санатараў“ Сельсаюзу пад назовам „Народ“. Паміж даволі пікантнае палемікі з „Сялянскай Нівай“ і „Бел. Крыніцай“, газэта зьмяшчае цікаўнае адкрыцьцё. Аказваецца, што сувязь хадэкаў і сельсаюзьнікаў з дэфэнзывай і дэфэнзыўнымі арганізацыямі ідзе далей, чым можна было думаць: апрача „супольнага супрацоўніка“ хадэцка-сельсаюзьніцкае прэсы і дэфэнзывы пана Сьветазара-Смрэчыньскага, апрача Міцькі і Гардзея, „смычку“ праводзе і... **скарбнік Хрысьціянска-Дэмакратычнае Партыі, які адначасна зьяўляецца і сябрам павлюкевічавай арганізацыі „Беларуская Хатка“!**

Адкрыцьцё вельмі цікаўнае, хаця — зусім не неспадзяванае...

Асаблівыя зладзеі. У Вільні ў кватэрах беларускіх дзеячоў і ўстановаў пачаліся дзіўныя крадзежы. Гэтак у тую пятніцу, 19 жніўня, на дзьвярох кватэры грам. Луцкевіча ня ведама хто ў паабедніх гадзінах зламаў прыбітую на дзьвярох скрынку да пісьмаў і выкраў усю карэспандэнцыю. А вось у ноч з нядзелі на панядзелак (з 21 на 22 жніўня) такія-ж, відаць, зладзеі забраліся ў памяшчэньне рэдакцыі „Маланкі“, ды добра тамака пагаспадарылі. Пакой рэдакцыі яўна пераТрэсены. Таксама пераТрэсены і пакой грам. Маразовіча, якога ня было якраз у Вільні. Ці што ўкрадзена, дагэтуль ня высьнена.

Афіцыяльны курс грошы на 23 жніўня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

23./VIII. на чорн. біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

АБВЕСТКА.

Горадзенская Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы даводзіць да ведама усіх Гурткоў і сяброў, што Канцэлярыя Управы перанесена з вуліцы Парахавой 4—42 на вуліцу Ожэшковую № 8 п. 6 (насупроць Горадзенскага Старосты); за справамі просім зьвяртацца, а таксама ўсе лісты скіровываць па наступнаму адрэсу: Grodno, ul. Orzeszkowej № 8, m. 6.

Горад. Акр. Упр. Т-ва Бел. Шк.

3 работніцкага жыцьця у Заходняй Беларусі.

„Роботнік" піша:

Дырэктар Дзяржаўных Тартакоў у Чорнай Весі з нячуванай ненавісьцяй атакуе арганізацыю Клясавага Саюзу Дрэўных Работнікаў. Найбольш чынных працаўнікоў Саюзу, як Сальшынскага, Хацея і інш., ён як літасьці выкінуў з працы, заявіўшы, што, пакуль ён будзе дырэктарам, дык выкінуты—хоць-бы „здыхалі з голаду, ня вернуцца да працы ў яго закладах".

„Роботнік" расказвае цікаўную біяграфію гэтага дырэктара Чайкоўскага. Ня так даўно гэты важны дырэктар-паляк быў скромны арандатар млына пад Белай Царквой (у Радавай Украіне), дый насіў тады, як „украінец", белую сялянскую „сьвітку". Прыехаўшы ў панскую Польшчу, п. Чайкоўскі карміўся нейкі час, прадаючы ў дробнай краме мыла ў Сельцах. „Роботнік" піша, што ён быў тады („ўдаваў") вельмі „чулым на людзкае гора чалавекам і добрым дэмакратам" (ці ня быў навет цяперашні „дырэктар" тады і—пэпэесам?!). Але, пасьля атрыманьня „пасады" дырэктара, дый яшчэ—Дзяржаўных Тартакоў, гэты панок „падняў галаву" ды пачаў душыць работнікаў і іх арганізацыі.

3 жыцьця Горадні.

Пратэст работнікаў. У сераду 10-га жніўня ў салі спартовага клюбу „Ютшэнка", вул. Дамініканская 18, адбыўся многалюдны пратэстацыйны мітынг, на якім гарадзенскія работнікі і работніцы далучылі свой голас да агульнага пратэсту работнікаў усяго сьвету проці выкананьня сьмяротнага прысуду, які выдаў амэрыканскі буржуазны суд на работнікаў-анархістаў Сакко і Ванцэтті, ды які меў быць выкананы 11-га жніўня.

Мітынг быў бурлівы, чутно было выкрыкі проці буржуазных судоў і інш.

Па сканчэньні мітынга паліцыя пры выхадзе хацела заарыштаваць аднаго работніка, Зуракова А. Але работнікі не дапусьцілі, і толькі ужо на вуліцы, калі зьявілася больш паліцыянтаў, якія разагналі работнікаў,—Буракова арыштавалі і, пасадзіўшы на машыну, павезьлі да „ўжэнду сьледчага". **Народны.**

АБВЕСТКА.

Білет, выданы на імя Коўша Сымона за № 550 ад 12. Х. 27. Галоўнай Управай у Вільні, пад час ліквідацыі „Грамады" быў забраны паліцыяй і, ня гледзячы на інтэрвэнцыю ў гэтай справе Акружнай Управы, да гэтага часу ня вернены, — дзеля чаго білет лічыць уняважненым.

Уняважняецца таксама білет, выданы на імя Дзешкі Варфаламея Акружнай Управай ад 10. I. 27 г. за № 120, бо Дзешка выключаны з ліку сяброў Т-ва Плюскалаўскім Гурткам за невыкананьне § 12 Статуту.

Горадзенская Акружная Управа Т-ва Бел. Школы.

Выбары у Самаурады.

Выбары ў раду.

(Слонімшчына).

Нарэшце адбыліся доўгачаканыя выбары ў гмінны самаўрад у Дзявятхаўскай гміне, а думалі, што і канца ня будзе гаспадараваньню 7-гад. нашай гмін. рады, бо яшчэ ў леташнім годзе усе нашы вёскі пісалі пратэсты да п. старасты з дамаганьнем перавыбараў, але безрэзультатна. Стартэта нарэшце ўсе пратэсты ў гміну, ці згаджэнцыя старая гмінная рада на перавыбары, якая ведама... да канца свайго жыцьця думала гаспадараваць гмінаю. Гэта гаспадараваньне кожнаму селяніну нашай гміны далося адчуць, як мала, так і кішэняю. І гэтым самым дабра навучыла і дала зразумець сялянам, якіх трэба правасьці людзей, каб справядліва вялася гмінная гаспадарка, а перадусім, каб задавальняць сялянскія патрэбы, дык бараніць іх інтарэсы.

Ня гледзячы на ўсе стараньні тутэйшых паноў і паўпанкаў, ня гледзячы на ўсю іх асабліваю ненавісьць аб выбарах і падрыхтоўку (сяляне даведаліся ў апошнія дні) да іх і тую агітацыю і абяцанкі, якія сыпаліся як з мяшка і пастрахі, што выбараў не зацьвердзяць, калі пройдуць былыя грамадаўцы-сяляне дружнай сьцянай адказалі, што будуць выбіраць толькі тых людзей, якім вераць і на якіх могуць палажыцца, што не прададуць народных інтарэсаў. Але ўсё-ж такі ўсе заходы п. Бяляўскага, былага лясьнічага і былага войта Мізгіра, якому, як відаць, хочацца пабудаваць другі паровы млын, спорыліся ні на што. Не памог яму навет і іх падпісьнік солтыс з вёскі Саснойкі, які так ахвярна расьпінаўся, каб зноў пабачыць свайго пана войта на гэтай пасадзе.

Першыя выбары на абводах адбыліся 13-га чэрвеня. Як трэба было спадзявацца, не абышлося і без рэпрэсіі і ашуканства дзе засядалі ў выбарных камітэтах толькі „ясныя" паны, дык круцілі як маглі, каб правесьці свае „ясныя" асобы, а „хамаў" не дапусьціць: пазбаўлялі права голасу, выкідалі з сабраньня, калі хто быў якім-кольвек арыштам караны, або знаходзіўся пад судом. Сяляне запратэставалі і выклікалі гэтым у сабраўшыхся абурэньне і замяшаньне. Карыстаючы з гэтага выбарчы камітэт уніcяў абшарніка Сьлізьня і яго „жондцу" Сьвянціцкага, прыпісаючы ім большасьць галасоў. Сяляне, даведаўшыся аб гэтым, запратэставалі. Тады панкі сабраньне закрылі пагражаючы яшчэ карамі. Такім чынам сілаю накінулі нам абшарніка.

Трэба адзначыць, што з усіх абводаў толькі два абводы дрэнна спраўляліся: Яруціцкі, які выбраў на выбаршчыка польскага вучыцеля, што вучыць дзяцей у іх вёсцы (ён-жа, як кажуць, ёсьць канфідэнтам у паліцыі) і Трыбушкоўскі, што дапусьціў ашуканствам выбраць абшарніка Сьлізьня.

Выбары радных адбыліся 19-га чэрвеня. Гмінны выбарчы камітэт складаўся з самых панкоў і іх падлізаў. Пры выбарах былі прысутнымі 4 паліцыянты, з іх 2 камандаты пастарункаў, інспэктар выбарчы з старасьтва, які высьвятліў парадак выбараў і яшчэ адзін невядомы панок, аб якім калісь казалі „гарохавае пальто". Было выстаўлена тры сьпіскі: сялянскі № 1, абшарніцкі № 2 і сялянскі № 3 невялікай групкі людзей утвораны адным солтысам, якому вельмі хацелася папасьць у радныя. Сьпісак № 1 атрымаў 54 галасы і 11 уняважненых, № 2 — шэсьць галасоў і сьпісак № 3 — 14 галасоў.

Дзеля таго, што 12 галасоў уняважнена і 13 выбаршчыкаў не зьявілася на выбары, 3 вольныя месцы ў раду дададзены па аднаму да кожнага сьпіску. Гэткім чынам па сьпіску № 1 прайшло 6 радных, № 2 — 2 (абшарнік і асаднік) і па сьпіску № 3 — 2, усіх 10 радных з якіх 8 беларусаў, заслугоўваючых на поўнае даверые, як шчырых абаронцаў сялянскіх інтарэсаў.

У ваколіцы Мізгірах „паны шляхта" (як яны сябе называюць) каталікі беларусы чуць вайны не распачалі паміж сабою, не гаворачы аб лаянках дый зьнявагах, якія прышлося перанесьці тым, якія з якіх-кольвек прычын ня прышлі на выбары, кажучы, як то можна каб „хамы" перамаглі дый намі кіравалі. Дагэтуль амаль-што ўсе радныя і войт былі з гэтае ваколіцы, а на гэты раз „панкі"... дасталі „дулю"... Усе панкі вельмі незадаволеныя з гэтых выбараў. Падалі да п. старасты некалькі пратэстаў аб перавыбарах, але спагаду не знайшлі, бо выбраную раду староста зацьвярдзіў. (Пэўна памог гэтаму радны абшарнік Сьлізень). Сяляне вельмі ўцешыліся, бо каб былі перавыбары, то напэўна не адзін панок не прайшоў-бы ў раду.

А вось зьбліжаюцца выбары войта, дык панкі ня трацяць надзеі, асабліва стары войт Мізгер, якому так хочацца засесьці на гэта „даходнае" месьцячка... Хіба толькі пан староста над вамі зьлітуецца ды, паказаўшы сваю „Канстытуцыйна-дэмакратычную" магчымасьць, назначыць, бо на гмінную раду няма чаго спадзявацца.

Аляксандар Лашко.
(Новы радны).

Выбары ў раду.

(Цырынская вол., Наваградчына).

Выбары ў гмінную раду прайшлі вельмі добра, г.з.—каго сяляне хацелі, таго і правялі, апрача аднаго раднага, які, хаця і беларус, але лічыць чябе палякам і стаіць на груньце аховы панскіх інтарэсаў. Усяго ў радзе 12 чалавек, з якіх 11 — зьяўляюцца прадстаўнікамі і выбранцамі сярмяжнага люду. Цікава адзначыць, што ў часе выбараў у гмінную раду, паны, якія былі выбаршчыкамі і думалі сваімі хітрыкамі разьбіць сялянскую сьвядомасьць, зрабілі 5 сьпіскаў, з якіх першымі кандыдатамі выставілі сябе, а далей навет і тых, каго яны ня любяць і хто быў кіраўніком былай грамады ў гміне. Годзе вам, паночкі, хітрыць і падлізвацца да мужыка ў часе выбараў, бо гэты мужык ужо зразумеў, што вы як „не садзіцесь" а ў будаўнікі сялянскага жыцьця „не гадзіцесь". Войт і заступнік ягоны — гэтак сама выбранцы сялянскія.

Падпішчык 3896.

Выбары валасное рады ў м-ку Падароск.

(Ваўкавыскага павету).

Як відно было з газэтаў, усюды ідуць выбары валасных самаўрадаў, а ў нас і чуткі аб гэтым ня было. Нарэшце і мы дачакаліся гэтага мамэнту. Старастаю быў вызначаны Валасны Выбарны Камітэт, у склад якога ўвайшлі: старш. — войт гміны Чаплеўскі (шляхціц), сябры: Радзэвіч Ал. (сын слаўнага фэрмера), Дуброўскі Пр. (чалавек стары, не адпавядаючы гэтаму назначэньню) і адзін асаднік (вельмі зацікаўлены) адным словам былі вызначаны людцы, а ня людзі. Гэтак сама было зроблена і з абвадовымі камітэтамі, што не абышлося без пратэстаў з боку сялян. 6-га жніўня г. г. а 11 гадз. дня адбыліся выбары. Выбаршчыкаў было вызначана 100 чал. з якіх 7 чал. не явіліся, а двох былі выдалены, як ня меўшыя 25 г. Галасаваньне было па сьпісках і закрытае. Вынікі выбараў наступныя: сьпісак № 1 — абшарніцкі, атрымаў 16 гал.—2 мандаты, сьпісак № 2 — асадніцкі, 10 гал. — 1 мандат, але ўвайшоў не асаднік а тутэйшы беларус, якіх яны ўпісалі ў сьпісак дзеля заманкі людзей, каб гэткім парадкам атрымаць большую колькасьць галасоў; — сьпісак № 3 — сялянскі, атрымаў 65 гал. — 7 мандатаў. Выбралі сьвядомых сялян-беларусаў, на якіх можна мець надзею, што карысна будуць працаваць для сярмяжнага люду. А вам, выбаршчыкам вёсак Гупчычы, Краскі і Омшары, ганьба! як пайшоўшым у блёку з абшарнікамі і аддаўшым свае галасы за іх сьпісак, і тым здрадзіўшым сваім братом сялянам. Хаця-ж некатарыя выбаршчыкі, пад абшарніцкім уплывам, здрадзілі, але ўсё-ж такі большасьць мандатаў атрымалі сяляне-беларусы.

„Беларус".

Выбары ў мястовую раду м. Пружан.

(Пружанскага павету).

Ніколі ня было так гучна ў Пружанах, як пры выбарах у мястовую раду. Натварылася аж 11 сьпіскаў, з якіх кожны за ўсялякую цану стараўся правесьці сваіх кандыдатаў. Пушчаны былі ў ход усе магчымыя способы агітацыі; сьцены ўсе былі аблеплены афішамі, на дахох і ваканьніцах панамазвалі таксама фарбаю нумары сьпіску. Мітынгам ня было канца.

З адзінаццаці сьпіскаў толькі сьпісак № 3 жыдоўскага работніцкага грамадзянства быў добра з'арганізаваны, дзеля чаго й удалося яму правясьці аж 8 кандыдатаў.

Астальныя сьпіскі № 1, 5, 7, 8, і г. д. былі або ўрадавыя або з'арганізаваны адзінкамі, якія за ўсялякую цану стараліся ўлезьці ў самаўрад.

З іншых ужо буржуазных сьпіскаў вызначыўся сьпісак № 6 жыдоў сіоністаў, якія ня толькі што вялі сільную агітацыю за сабраныя 1000 зл., але атрымалі з Варшавы 500 даляраў.

Ня горш агітаваў і сьпісак № 4 п. н. „Клюб Працы" на чале з былым бурмістрам Выбраноўскім, аднак атрымаў толькі 3 манд.

Апрача вышэй успамянутых, атрымаў 3 мандаты сьпісак № 2 на чале з Бараноўскім — палякам.

Усе іншыя сьпіскі праваліліся. Беларускіх кандыдатаў, на жаль, не прайшло сьвядомых аніводнага, апрача 2-х асоб, якія пралезьлі ў польскіх сьпісках, але несьвядомыя—беларусы.

Сьпіску чыста беларускага ня было, што сьведчаць аб слабай арганізацыі нашага мястовага грамадзянства.

Трэба ўспомніць аб сьпіску № 11, на чале якога стаяў знаны ўсім з круцельства мяшчанін Маркевіч, які выдаў больш 200 зл. на агітацыю. Будучы старастай царквы, ён загадаў свайму парабку аклеіць усе стаўбы наўкола царквы, а ў дзень выбараў г. ё. 17 ліпня гэты сам парабак езьдзіў на самакаце і на ўсе лады выхвальваў свайго гаспадара і ягоны сьпісак. Аднак, ня гледзячы на ўсё гэта, ён аканчальна праваліўся.

Выбары ў мястовую раду хай будуць повадам да арганізацыі беларускага грамадзянства. Хай за прыкладам жыдоўскіх работнікаў з сьпіску № 3 арганізуюцца ўсе ў моцную беларуска-работніцкую арганізацыю і гэтым самым пакажуць, што і беларусы здольны да працы, а пакуль-што нам трэба толькі цешыцца, што хоць жыдоўскім работнікам удалося правесьці сваіх кандыдатаў, бо работнік, якое ён-бы ня быў нацыянальнасьці, а ўсё-ж такі хутчэй зразумее патрэбы працоўных, а разам і беларусаў.

Кастусь Бяздольны.

Усячына.

Хуткасьць птушынага лёту

Адзін нямецкі вучоны зрабіў досьледы хуткасьці птушынага лёту. Досьледы паказалі, што некаторыя птушкі лётаюць з хуткасьцю кур'ерскага поезда. Напрыклад, шпак лётае хутчэй за іншых птушак—звыш 75 кілямэтраў у гадзіну, каўка — 51, папугай—59, грунгач—52, варона і чайка—50 кілямэтраў. Найменшая хуткасьць лёту са ўсіх птушак у ястраба—41 кілямэтр у гадзіну.

Са сьвету зьвярын.

Вялікі прыроднік Ліннэ налічыў у свой час на сьвеце 1.100 жывучых зьвярын. Ад таго часу зарэгістравана столькі новых сартоў зьвярын, што сяголетня лічаць іх да 400.000. Найбольшы лік сартоў прыпадае ня сям'ю аваднёў, іх аж 280.000. Вельмі многа мягкацелых—да 10.000 сартоў. Сям'я вужак налічае да 2.500 сартоў, а сям'я сысуноў лічыць усяго толькі 2.300 сартоў. Тропікавыя краіны маюць найбольш сартоў рознай зьвярыны, пры гэтым найбольш мае Паўднёвая Амэрыка, а найменш Аўстралія. Ад экватара да канцавосьсяў лік сартоў зьвярыны памяншаецца, але не памяншаецца лік самых зьвярын, асабліва марскіх, якіх і тут вельмі многа.

Бедная ты, наша культура!

(*Замест рэцэнзіі*).

„Агентуры" чужакоў дагэтуль паганілі толькі нашае нацыянальнае імя, нашы нацыянальныя ідэалы, брудам сваім забіваючы сьвятасьць іхнюю для нас. Цяпер яны дабраліся й да нашае культуры, каб фальшаваць ды паганіць і яе...

Доказ гэтага—выданы палякам Умястоўскім першы нумар журнала „Беларуская культура". Мала таго, што ўвесь гэты журнал прасякнуты аднэй яснай і выразнай палітычнай тэндэнцыяй: далоў Маскву і хай жыве Польшча! Самы зьмест таго, што журнал мае падаваць нашаму народу, як „культурную" страву,—ёсьць фальш і мана.

Журнал нібы-то „незалежніцкі": так, прынамся сам сябе—называе! Але, учытаўшыся глыбей у зьмест ягоны, пабачым ясна, як на далоні, што лёзунгам незалежнасьці журнал маніцца толькі змагацца з прыхільнасьцяй нашых масаў да нашага дзяржаўнага будаўніцтва на Усходзе — ў межах Радавага Саюзу. „Праўдзівую" незалежнасьць беларусы маюць дастаць..... праз Польшчу!

Як-быццам ня было ў Польшчы беластоцкага працэсу „45", ды нялічаных іншых; як-быццам пасол Баран і доўгі сьцяг іншых нашых незалежніцкіх дзеячоў не пакутаваў і не пакутуе дасюль у катаржных турмах; як-быццам уся незалежніцкая работа пад Польшчай, дапусканая ўладай, не абмяжоўваецца... банкетамі ў зачыненай салі панскага рэстарану, ладжанымі кс. Станкевічам з Ярэмічам, Рагуляй, Умястоўскім, Мамоньскай і іншымі Косьцевічамі!

Характэрная дэталь: на 25—26 страніцах „Бел. Культуры" зьмешчаны ярка-незалежніцкі верш, які — паводле заявы рэдакцыі — ня мог быць надрукаваны ў Менску дзеля цэнзурных прычын. Вось-жа рэдакцыя „Бел. Культуры" ўчыніла над гэтым вершам сваю запраўды-ж драконаўскую цэнзуру: з яго выкінены ўсе вострыя выступленьні проці Польшчы і пакінены ў ім толькі роўна вострыя выступленьні проці Масквы! Ці-ж гэта не агіднае фальшаваньне думак аўтара, ці-ж гэта не фальшаваньне і самае нашае незалежніцкае ідэі, якая не арыентуецца ні на Маскву, ні на Варшаву, а выключна на сябе—на Беларусь?!....

Ня будзем больш затрымлівацца на стацьцях і заметках, зьмешчаных ў № 1 „Бел. Культуры": ў-ва ўсіх іх—тыя ж самыя думкі, толькі сьпяваныя на розныя лады. Зьвернемся да культурнага боку гэнае „Беларускае Культуры".

Тут дык проста з жахам прыходзіцца гаварыць аб культурным роўні людзей, якія ўзяліся „тварыць" беларускую культуру. Раскрываем на 31 страніцы стацьцю „Новыя творы Я. Коласа" і з першых-жа слоў сустракаем гэткую „красачку":

Якуб Колас—„ня толькі вялікі паэт, аўтар „Песьняў Жальбы", „Сымона Музыкі" і „Новае Зямлі".... Пад псэўданімам Тараса Гушчы ён узбагаціў і беларускую прозу"...

Паны! То-ж вучань пятае клясы ўжо ведае, што паэзія у роўнай меры абыймае мастацкія творы, пісаныя вершам, як і прозай! Што вершамі можа быць пісана і зусім непаэтычная рэч (прыкладам—дзеля лягчэйшага завучэньня напамяць — якоесь граматычнае правіла!), і гэта ня будзе паэзія,—а ў прозаічнай форме могуць пісацца і пішуцца творы нязвычайнае паэтыцкае цэннасьці! І ці-ж не найлепшы доказ убожства „культуры" рэдакцыі „Беларускае Культуры" гэнае ўмаўляньне чытачом, быццам тое, што пісана вершамі,—гэта „паэзія", а што пісана ня вершамі—гэта „проза"?!

Дзякуй вам за такую „культуру"! Ад яе неяк далятае запах таго прадукту, з якім дагэтуль—па свайму фаху—мелі дзела паны рэдактары журнала.... А яшчэ-ж „культурны" рэдактар лятуціць аб заняцьці—пры дапамозе польскае ўлады—становішча кіраўніка Віленскае Беларускае Гімназіі! То-ж яго ўласныя вучні засьмяялі-бы: яны напэўна і бяз гэткіх „культурнікаў" ведаюць, што такое паэзія і што такое проза.

Пагана стаіць справа і з беларускай мовай „Бел. Культуры": скрозь або русіцызмы, або—полі шчызна вылазе, быццам шыла з мяшка.... І можам толькі пашкадаваць, што ў такую—апраўу" і „абработку" папалі творы бязумоўна здольнага, толькі йшчэ нявыробленага маладога нашага паэта Бартуля, якія прадстаўляюць, здаецца, найцэннейшую частку гэнае „Беларускае Культуры". **К. Ф.**

Да нашых падпішчыкаў.

Пасылаючы рахункі, просім пав. грам. Падпішчыкаў урэгуляваць падпісную плату.

Хто да 1 кастрычніка не ўрэгулюе падпіснай платы, або ня прышле паведамленьня, што грошы будуць прысланы, таму высылка газэты будзе спынена.

Адміністрацыя.

Рэдактар-Выдавец: П. Кумпяк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.